КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце БДПУ
__________ У.У.Шлыкаў
«06» 06 __________ 2017 г.
Рэгістрацыйны № УД-30-01-37-2017/вуч.

# КАЛЯНДАР У ЧАСЕ І ПРАСТОРЫ: ВЫТОКІ, СІНТЭЗ КУЛЬТУР, СТЫЛІ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне (па выбары)
для другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратуры)
па спецыяльнасці:
1-08 80 02 – Тэорыя і методыка навучання і выхавання
(сусветная і айчынная культура)

2017 г.

2

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі АСВА 1-08 80 02-2012 па спецыяльнасці 1-08 80 02 – Тэорыя і методыка навучання і выхавання (па галінах і ўзроўнях адукацыі), № 108 ад 24.08.2012 г.

СКЛАДАЛЬНІК:
Н.Г. Мазурына, дацэнт кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:
Кафедрай тэорыі і методыкі выкладання мастацтва
(пратакол № 10 ад 12.05.2017 г.);
Загадчык кафедры Н.В.Бычкова

Саветам факультэта эстэтычнага выхавання
(пратакол №10 ад 22.05.2017 г.)
Нам. дэкана па вучэбнай рабоце Т.В.Сярнова

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага
упраўлення БДПУ
_______________ Т.В. Шчыпунова

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне “Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі” (па выбары) распрацавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта па спецыяльнасці для другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратуры) 1-08 80 02 – Тэорыя і методыка навучання і выхавання (сусветная і айчынная культура).

“Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі” – вучэбная інтэграваная дысцыпліна, якая знаёміць студэнтаў з сістэмай і гісторыяй летазлічэння народаў свету, развіццём каляндарных стыляў на беларускіх землях, паняццямі хранонімa, Навагоддзе/Навалецце, народны каляндар і беларускі народны каляндар (БНК) у прыватнасці. Яна непасрэдна звязана з гісторыяй сусветнай культуры, гісторыяй беларускай культуры, фалькларыстыкай, этналогіяй, культуралогіяй.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі” (па выбары) накіравана на вырашэнне самых важных задач падрыхтоўкі будучых выкладчыкаў, а таксама на іх асабістае развіццё і ўдасканаленне. Дадзеная вучэбная дысцыпліна з’яўляецца адной з важных у сістэме падрыхтоўкі выкладчыкаў па культуралагічных дысцыплінах, паколькі накіравана на актывізацыю і сістэматызацыю ведаў, якія былі набытыя на прадметах культуралагічнага і народазнаўчага цыклаў, дазваляе практычна выкарыстаць і ўдасканаліць атрыманыя ўменні і навыкі, садзейнічае развіццю педагагічных, псіхалагічных і арганізатарскіх здольнасцяў магістрантаў.

***Мэта вучэбнай дысцыпліны*** – авалоданне сістэмай ведаў аб сродках і прынцыпах летазлічэння розных часоў і народаў, аб беларускім народным календары (БНК) у кантэксце гісторыі і культуры народаў свету.

***Задачы вучэбнай дысцыпліны:***

– пазнаёміць магістрантаў з гісторыяй летазлічэння народаў свету; развіццём каляндарных стыляў на беларускіх землях;

– сфарміраваць паняцці пра хранонімы, Навагоддзе/Навалецце, народны каляндар і беларускі народны каляндар (БНК), іх фарміраванне, структуру і змест;

– сфарміраваць уменні і навыкі асноўных каляндарных вылічэнняў;

– развіць навыкі вывучэння фальклорна-этнаграфічнага зместу асноўных свят традыцыйнай сістэмы летазлічэння, іх каляндарна-астранамічнага генэзісу.

**Узаемасувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі спецыяльнасці**

| Назва вучэбнай дысцыпліны, вывучэнне якой звязана з вучэбнай дысцыплінай “Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі” | Пералік актуалізуемых на занятках па вучэбнай дысцыпліне “Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі” комплексаў ведаў, якія фарміруюцца на іншых вучэбных дысцыплінах |
|---|---|
| Філасофія і метадалогія навукі | Практычнае выкарыстанне ведаў аб этапах развіцця філасофскай думкі і светапоглядных культуралагічных канцэпцыях. |
| Асновы інфармацыйных тэхналогій | Практычнае выкарыстанне навучальных мультымедыйных праграм, праграм тэхнічнай апрацоўкі дадзеных пры засваенні асобных тэм дысцыпліны, выкарыстанне праграмы Microsoft PowerPoint для стварэння мультымедыйных прэзентацый па асобных тэмах дысцыпліны. |
| Сучасныя тэндэнцыі развіцця тэорыі і методыкі культуралагічных дысцыплін | Практычнае выкарыстанне ў распрацоўцы метадычных матэрыялаў для выкладання культуралагічных дысцыплін ведаў і навыкаў, звязаных з вывучэннем розных каляндарных стыляў і традыцый. |

**Патрабаванні да засваення вучэбнай дысцыпліны**

Патрабаванні да ўзроўню засваення зместу вучэбнай дысцыпліны “Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі” (па выбары) вызначаны адукацыйным стандартам па спецыяльнасці для другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратуры) 1-08 80 02 – Тэорыя і методыка навучання і выхавання (сусветная і айчынная культура).

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі” (па выбары) павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый.

Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый магістра.

Магістр павінны мець:

АК-2. Метадалагічныя веды і даследчыцкія ўменні, які забяспечваюць вырашэнне задач навукова-даследчай, навукова-педагагічнай, інавацыйна-педагагічнай, вучэбна-метадычнай, арганізацыйна-кіраўнічай, экспертна-ацэначнай дзейнасці.

АК-6. Здольнасць здзяйсняць бесперапынную самаадукацыю і самаўдасканальванне ў навукова-педагагічнай, вучэбна-метадычнай і арганізацыйна-кіраўнічай дзейнасці.

Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый магістра.

Магістр павінны быць здольным:

ПК-НД-1. Выкарыстоўваць сучасныя дасягненні педагагічнай навукі і перадавых педагагічных тэхналогій.

ПК-ІП-1. Здзяйсняць педагагічны пошук новаўвядзенняў.

ПК-ІП-2. Ствараць педагагічнае новаўвядзенне.

ПК-ІП-7. Выкарыстоўваць індывідуальныя крэатыўныя здольнасці для арыгінальнага вырашэння даследчых і прафесійных задач у галіне адукацыі.

ПК-ВМ-1. Вырашаць тыпавыя метадычныя задачы.

ПК-ВМ-3. Распрацоўваць метадычныя інструкцыі, вучэбна-метадычныя дапаможнікі, метадычныя рэкамендацыі па актуальных праблемах педагагічнай навукі і практыкі.

ПК-ВМ-4. Распрацоўваць і выкарыстоўваць сучаснае вучэбна-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу.

ПК-ВМ-5. Распрацоўваць метадычныя сцэнары правядзення заняткаў і выхаваўчай работы, аналізаваць вынікі іх рэалізацыі ў адукацыйных установах розных тыпаў.

ПК-АК-1. Арганізоўваць педагагічны працэс ва ўстановах адукацыі розных тыпаў.

ПК-ЭА-4. Распрацоўваць дыягнастычны інструментарый для правядзення экспертызы і ацэнкі, арганізоўваць крытэрыяльную экспертызу і ацэнку разнастайных аспектаў навукова-даследчай і педагагічнай дзейнасці.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі” (па выбары) магістрант павінен ***ведаць:***

– асноўныя сістэмы летазлічэння народаў свету і іх адлюстраванне ў гісторыі культуры;

– паняцце аб народным календары і яго адрозненне ад царкоўнага і іншых;

– адпаведнікі ў БНК шасці каляндарных стыляў;

– семантыку асноўных хранонімаў народнага календара, звязаных з раўнадзенствамі і сонцастаяннямі;

– прынцыпы складання пасхалій;

***умець:***

– карыстацца каляндарнымі табліцамі, формуламі, агляднымі (“вечнымі”) календарамі;

– арганізоўваць вучэбную дзейнасць па вывучэнні культуры каляндарных традыцый;

– рабіць асноўныя матэматычныя вылічэнні (стары і новы стылі, год “ад стварэння свету”);

– валодаць методыкай аналізу фальклорнага тэкста, выяўляючы язычніцкія і хрысціянскія элементы.

Згодна вучэбнаму плану спецыяльнасці 1-08 80 02 – Тэорыя і методыка навучання і выхавання (сусветная і айчынная культура) вучэбная дысцыпліна

“Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі” (па выбары) вывучаецца на дзённай і завочнай формах атрымання другой ступені вышэйшай адукацыі. Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны на дзённая форме навучання адводзіцца 82 гадзін, з якіх 36 гадзіны аўдыторных (у тым ліку лекцыйных 30 гадзін, 6 практычных), 46 гадзін прыпадае на самастойную работу студэнтаў. Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны на завочнай форме навучання адводзіцца 6 гадзін аўдыторных (лекцыйных).

Асноўнымі метадамі (тэхналогіямі) навучання, якія адлюстроўваюць мэту і задачы вучэбнай дысцыпліны, з’яўляюцца: праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне матэрыялу, пошукавы і даследчы метады); тэхналогія навучання як вучэбнага даследавання; камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (разумовы штурм, дыскусія, спрэчка-дыялог, круглы стол і інш.). Сярод форм правядзення семінарскіх заняткаў могуць ужывацца калёквіўмы, тэсты, а таксама традыцыйныя формы кантролю ведаў (вусныя адказы, комплексныя кантрольныя работы, паведамленні і рэфераты).

Самастойная работа студэнтаў прадугледжвае павышэнне ўзроўню прафесійнай кампетэнцыі па асобных пытаннях (аспектах) методыкі даследавання каляндарных традыцый. Асноўнымі формамі самастойнай работы студэнтаў з’яўляюцца: праца з літаратурай, падрыхтоўка дакладаў, рэфератаў па прапанаванай выкладчыкам тэматыцы, прагляд відэаматэрыялаў, наведванне музеяў, выстаў, канцэртаў, праца з Інтэрнэт-рэсурсамі.

Выніковай формай кантролю ведаў з’яўляецца залік у I семестры на дзённай форме навучання і II семестры на завочнай форме навучання.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## РАЗДЗЕЛ І. ТЭОРЫЯ ЛЕТАЗЛІЧЭННЯ

### *Тэма 1.* Астральныя ўяўленні чалавека і месяцавае злічэнне часу

Фарміраванне ўяўленняў чалавека аб зямным і нябесным парадку. Назапашванне практычнага вопыту і тэарэтычных ведаў аб сусветнай цыклічнасці. Развіццё летазлічэння ў народаў свету. Археалагічныя знаходкі глінянага посуду з каляндарнымі элементамі, іншыя дакументальныя і матэрыяльныя сведчанні старадаўніх летазлічэнняў. Развіццё астранамічных ведаў на беларускіх землях.

Фарміраванне паняцця "каляндар". Этапы развіцця каляндарнай сістэмы. Асноўныя каляндарныя паняцці: сінадзічны месяц (каля 29 сутак 12 гадзін 44 хвіліны 2,3 секунды), месяцавы (354,367056 сутак) і трапічны, астранамічны (365 дзён 5 гадзін 48 хвілін 46,1 секунды) год. Раўнадзенствы (20–21 сакавіка, 22–23 верасня) і сонцастаянні (21–22 чэрвеня, 21–22 снежня). Асноўная праблема календара – неадпаведнасць дзвюх астранамічных велічынь: трапічнага года і сінадзічнага месяца.

Тыпы календароў: месяцавы, сонечны, сонечна-месяцавы.

Каляндарныя стылі (раждзесцвенскі, студзеньскі, сакавіцкі, благавешчанскі, пасхальны, вераснёўскі). Новы год/Новае лета.

Астральныя і месяцавыя ўяўленні беларусаў (паняцці пра нябесныя свяцілы і месяцавыя фазы). Семантыка паняццяў беларускага месяцавага злічэння часу (мяжа, маладзік, моцныя дні, падпоўня, поўня, рушанне, гнілуха, ветах).

### *Тэма 2.* Сонечнае і сонечна-месяцавыя летазлічэнні

Эвалюцыя пошукаў чалавецтва аптымальных сродкаў летазлічэння, сталай кропкі ў колазвароце дзён. Летняе сонцастаянне. Сусветнавядомы "каменны хлеў" Стоўнхендж на паўднёвым захадзе Англіі (4000 гадоў). Падобныя мегалітычныя пабудовы ў Хакасіі, Літве, Арменіі, Расіі, на Украіне. Урочышча Камяні на Полаччыне – беларускі Стоўнхендж.

Першы сонечны каляндар (365 сутак) у Егіпце (4 тысячагоддзе да н. э.). Кумранскі каляндар, календары старажытных мая.

Свята летняга сонцастаяння – Купалле. Звычай "гульні сонца" як сведчанне шматгадовых назіранняў чалавека за асноўным свяцілам з астранамічна-часавымі мэтамі. Язычніцкія ігрышчы і пераследаванні іх царквою. Навагодняя (Навалетняя) сімволіка Купалля: "кола", "новае лета" і інш.

Сістэма сонечна-месяцавых календароў. Старажытны Кітай. Вавілон. Іудзея. Старажытны Рым. Сонечная хіджра.

Юліянскі (46 г. да н.э.) і грыгарыянскі (1582 г.) календары. Паняцці пра новы і стары стылі ўсходнеславянскіх народаў. Спосаб пераводу стыляў. Пасха і яе вылічэнне. Грыгарыянскае летазлічэнне ў Вялікім княстве Літоўскім і адлюстраванне яго ў Баркулабаўскім летапісе і інш. дакументах.

Аглядныя (“вечныя”) календары, формулы і каляндарныя табліцы. Іх практычнае выкарыстанне.

### *Тэма 3.* Цыклічны каляндар і каляндарныя эры. Семантыка дзён тыдня і гадзіннікі

Паняцце аб сузор’ях задыяка (“жывёльны, або звярыны, круг”). Каляндарныя звычаі і абрады народаў Усходняй Азіі (кітайцы, карэйцы, японцы, манголы, цібетцы, в’етнамцы і інш.). Разнастайнасць сістэм летазлічэнняў у розных краінах. Цыклічныя календары народаў Паўднёва-Усходняй Азіі.

Каляндарныя эры як кропкі адліку часу. Эра ўладара Хуан Дзі (2637 да н.э.) цыклічнага календара ў Старажытным Кітаі. Адлік часу ў Старажытным Егіпце (асобна па гадах уладарання кожнага фараона), Старажытным Вавілоне (ад пачатку царавання Набонасара), Старажытнай Грэцыі (ад пачатку першай алімпіяды), Старажытным Рыме (ад заснавання горада і кіравання імператара Дыяклецяна). Эра “ад стварэння свету”: па старажытнаяўрэйскаму календару (3761 г. да н.э.) і візантыйскаму (5508 г. да н.э.). Эра мусульманскай хіджры (ад перасялення стваральніка іслама Мухамеда з Мекі ў Мядзіну). Эра Сака ў Індыі (78 г. н.э.).

Тыдзень як адзінка вымярэння часу. Паходжанне сямідзённага тыдня. Сонечныя, механічныя і інш. гадзіннікі.

Сімволіка і семантыка дзён тыдня ў народаў свету. Шчаслівыя і нешчаслівыя дні ў абрадавых календарах старажытных вавілонцаў «Меналогіях» (прыблізна 10 ст. да н. э.). «Злыя» дні ў каляндарных прыпісках XII–XIII стст., чарадзейных кнігах, старажытнарускім «Кветніку», беларускіх крыніцах.

Магічна-сэнсавае значэнне дня ў беларусаў: «мужчынскі», «жаночы» (па граматычным родзе), «посны» (панядзелак, серада, пятніца), «скаромны», «першы», «апошні», «цотны», «няцотны». Семантыка дня тыдня адносна спрыяльнасці і неспрыяльнасці ў гаспадарчых работах і сямейным жыцці. Адлюстраванне дзён тыдня ў вуснай народнай творчасці.

## РАЗДЗЕЛ ІІ. ГІСТОРЫЯ ЛЕТАЗЛІЧЭННЯ. КАЛЕНДАРЫ СВЕТУ

### *Тэма 4.* Гісторыя вывучэння каляндарных звычаяў і абрадаў

Аб’ектыўная неабходнасць пашырэння храналагічных рамак вывучэння каляндарных святаў – ад эпохі з’яўлення чалавека і да нашых дзён. Адсутнасць поўных і досыць дакладных сведчанняў пра каляндар і лёс традыцыйных звычаяў. Складанасць самога аб’екта даследвання – каляндарна-абрадавага свята па гістарычным паходжанні, складу ўваходзячых у яго элементаў і разнастайнасці выконваемых функцый.

Апора на асноўныя тэарэтычныя палажэнні Герадота наступных аўтараў. Гіпакрат, Арыстоцель, Пасідоній пра залежнасць народных святаў ад прыроднага асяроддзя. Герадот, Страбон аб запазычаннях звычаяў адным народам у іншага. Дэмакрыт, Лукрэцый аб эвалюцыйнай паслядоўнасці ў

развіцці звычаяў. Палібій, Тацыт пра ўплыў звычаяў на палітычную гісторыю і міжнародныя адносіны.

Пачатак сярэднявечча і агульны заняпад культурнага развіцця. Малалікасць пісьмовых крыніц пра звычаі і абрады. Рэдкія згадкі візантыйскіх пісьменнікаў VI–X стст. (Пракоп, Маўрыкій, Канстанцін), нямецкіх царкоўных гісторыкаў X-XII стст. (Адам, Тытмара, Гельмольт), падарожнікаў ва ўсходнія краіны XIII ст. (Плана Карпіні, Рубрук, Марка Пола). Адсутнасць навуковай цікавасці.

Заморскія плаванні і вялікія геаграфічныя адкрыцці эпохі Рэнесансу, пашырэнне разумовага гарызонту еўрапейцаў, знаёмства з новымі краінамі і іх парадкамі. Тэндэнцыя ідэалізацыі “добрага дзікуна” у адкрытых новых краінах. Італьянскі гуманіст пачатку XVI ст. П’етра Марцір і яго пазіцыя: “Гэта залаты век, без законаў, без прадузятасцяў суддзяў, без кніг”.

Тэорыя “высакароднага дзікуна” ў працах Жана дэ Леры, Бартоломе дэ Лас Касас, Мішэля Мантэня, Марка Лескарбо і іншых. Працяг традыцыі ідэалізацыі першабытнага чалавека ў асветніцкай літаратуры XVIII ст. – Русо, Дзідро і інш. Станоўчая адзнака традыцыйных звычаяў.

Адсутнасць класіфікацыі свята, чыста апісальны характар апавядання.

Канец XVIII – пачатак XIX стагоддзяў – праява цікавасці да еўрапейскіх народаў. XIX ст. – фарміраванне розных навуковых школ. Ідэйныя вытокі міфалагічнай (натурміфалагічнай, натурысцкай, астральна-міфалагічнай) школы – увасабленне сонца і іншых нябесных з’яў.

Развіццё навуковага даследавання календароў і каляндарных свят ў XX – пачатаку XXI стагоддзя.

### *Тэма 5.* Старажытнаіндыйскі каляндар. Кітайскі сельскагаспадарчы каляндар. Мусульманскі каляндар і летазлічэнне

Старажытнаіндыйскі каляндар. Старажытнаіндыйскія тэксты аб стварэнні свету, касмічным часе, касмічных гадах і сутках, эрах і перыядах. 5 календароў старажытнай Індыі. Адзіны нацыянальны каляндар Індыі, які дзейнічае з 22 сакавіка 1957 года, але выкарыстоўваецца рэдка.

Кітайскі сельскагаспадарчы каляндар. Дзяленне года на 24 сельскагаспадарчых сезоны па становішчы Сонца на экліптыцы. Адсутнасць сувязі сезонаў з рухам Месяца.

Выкарыстанне месяцавага календара ў гарадах-дзяржавах Месапатаміі (трэцяе тысячагоддзе да н.э.), Вавілонскім царстве, Арабскім халіфаце.

Мусульманскі каляндар і летазлічэнне. Пачатак мусульманскага летазлічэння ад перасялення Прарока Мухамада з Мекі ў аазіс Ясрыб (названы пазней горадам Прарока, гэта значыць Медзінай) у 622 г. Мусульманскі месяцавы каляндар Хіджры арабскага і турэцкага цыклаў у краінах Азіі і Афрыкі. Пераклад з Хіджры ў Міладзі (цяпер дзеючы сонечны каляндар).

### *Тэма 6.* Старажытнаегіпецкі каляндар. Каляндар майя

Старажытнаегіпецкі каляндар. Стварэнне каляндара ў даліне, які праіснаваў разам з Егіпецкай цывілізацыяй каля 4-х тысячагоддзяў. Сувязь яго паходжання з Сірыусам – яркай зоркай трапічнага небасхілу. Год – прамежак часу паміж двума геліакічнымі ўзыходжаннямі Сірыуса, што супадалі ў Старажытным Егіпце з летнім сонцастаяннем і папярэднічалі разліву Ніла, складае 365,25 сутак. Афіцыйны каляндар (для афіцыйных дакументаў). Вядзенне летазлічэння з моманту ўзыходжання новага кіраўніка з канца Старажытнага Царства. Выкарыстанне месяцовага каляндара ў рэлігійных і бытавых мэтах (для вызначэння даты рэлігійных святаў або ў асабістых лістах), а таксама для вызначэння пачатку розных этапаў сельскагаспадарчых работ.

Каляндар майя. Узнікненне ў чацвёртым тысячагоддзі да н. э. Сістэма календароў, створаных у дакалумбаву эпоху мезаамериканской цывілізацыяй майя. Выкарыстанне яго іншымі Цэнтральнаамерыканскі народамі – ацтэкамі, тальтэкамі і інш. Выгляд тыповай даты календара майя: 12.18.16.2.6, 3 Кімі 4 Соц, дзе 12.18.16.2.6 – дата доўгага рахунку, 3 Кімі – Цолькін, 4 Соц – Хааб.

### *Тэма 7.* Гісторыя Еўрапейскіх каляндарных стыляў. Старажытнагрэчаскі каляндар

Гістарычныя карані еўрапейскага календара. Фарміраванне ўласных календароў народаў Еўропы на аснове назіранняў і працоўнай дзейнасці.

Старажытнагрэчаскі каляндар. Існаванне ў гарадах і рэгіёнах старажытай Грэцыі ўласных календароў. Прыняцце рымскага (юліянскага) каляндара ў якасці афіцыйнага календара хрысціянскай царквы. Выкарыстанне яго грэкамі як асноўнага, пры захавані іудзейскага летазлічэння ад стварэння свету. Каляндарна-абрадавыя традыцыі грэкаў: праводзіны зімы, ад карнавалу да Вялікага посту, Першае мая – Дзень кветак і першамайскага вянка і інш.

Хрысціянізацыя ўсходнеславянскіх народаў і прыняцце летазлічэння візантыйскага ўзору з мясцовымі традыцыямі (эра – “ад стварэння свету”, веснавое Навалецце). Прыняцце Грыгарыянскага календара як удасканаленне юліянскага летазлічэння. Далейшыя пошукі аптымальных сродкаў календара. Афіцыйныя каляндарныя стылі еўрапейскіх краін.

## РАЗДЗЕЛ III. БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР: АСАБЛІВАСЦІ І ЭТАПЫ ІСНАВАННЯ

### *Тэма 8.* Прынцыпы і фактары фарміравання народнага календара

Народны каляндар як пэўная сістэма і хрысціянска-язычніцкі комплекс, сінтэз дзвюх культур. Яго структура, змест і адрозненне ад царкоўнага календара. Святы, прысвяткі – асноўныя зместанапаўняльныя элементы БНК.

Прынцыпы датавання (новы і стары стылі), падача хранонімаў (рэгіянальныя варыянты назваў), пашпартызацыі палявога матэрыялу, фальклярызацыі і хрысціянізацыі, паэтызацыі і кансервацыі.

Фактары фарміравання “народнай рэлігіі” і календара. Сацыяльна-палітычны фактар. Спрыяльныя умовы старажытна-беларускай дзяржавы – ВКЛ (талерантныя адносіны да дзядоўскай веры, кампрамісны характар уніі, адносна вольнае існаванне іншых веравызнанняў; неспрыяльныя ўмовы развіцця нацыянальнай культуры, мовы, калі даводзілася адасабліваццa ад чужароднага ўплыву).

Прыродна-геаграфічнага фактар. Памежнае становішча старажытных беларускіх зямель сярод заходняй і ўсходняй цывілізацый; рэгіён, што з’яўляўся часткай прарадзімы славян ці блізкі да яе; балотна-лясная глухамень, якая абмяжоўвала стасункі паміж іншымі народамі.

Фактар святочнага і бытавога характару. Традыцыі развіцця кірмашоў і мясцовых фэстаў; дзейнасць скамарохаў, варажбітоў, батлейшчыкаў, якая не так моцна падаўлялася, як у Расіі; бытаванне валачобніцтва, якога не наглядалася ў іншых народаў, і больш вольнае развіццё даўніх звычаяў і абрадаў.

### *Тэма 9.* Сінтэз язычніцкай і хрысціянскай культур

Царкоўна-рэлігійны фактар фарміравання народнага календара. Традыцыі братчыны ў правядзенні святаў свечкі (у папулярных святах, прысвечаных аднаму з хрысціянскіх патронаў, найлепшым чынам злучаліся дзве культуры); пакланенне родаваму абразу, мясцоваму святому, князю (св. Ефрасіння Полацкая, св. Барыс); пакланенне язычніцкім культам і наступная замена іх на хрысціянскія святыя месцы (камяні, крыніцы, дрэвы, могілкі, поле і г.д.); выкарыстанне “педагагічных прыёмаў” у хрысціянізацыі, падобнасці ў рэлігіях і замежнага вопыту і інш.

### *Тэма 10.* Традыцыйныя святы летняга і зімовага сонцастаянняў

Асноўнае свята лета – Купалле, сан-Джавані (у рымлян), Жан-Бацiст (у французаў), Сан-Хуан, або Сан-Жуан (у іспанцаў), святы Джон (у народаў Брытанскіх астравоў), святы Ханс (у нарвегаў), Іёнсок (у датчан), Мідсамар (у шведаў), Іван Купавац (у харватаў), Янаўдзень (у балгараў) і г.д. Падобнасць рытуалаў і абрадаў (паленне кастроў, скаканне праз іх, збор зеляніны, павер’і пра ведзьмаў, водныя купанні і інш.). Язычніцкая аснова і хрысціянскі элемент у летнім календары беларусаў і народаў Еўропы. Святы, прысвяткі і звычаі летніх месяцаў. Сінтэз дзвюх культур у паэзіі Купалля.

Зімовае Навагоддзе. Разнавіднасці святкавання Новага года зімою народамі свету. Асаблівасці адзначэння Навагоддзя ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Азіі, якія прытрымліваюцца сонечна-месяцава-юпітэрнага календара (з 21 студзеня па 20 лютага). Адзначэнне кельцкага (жывёлагадоўчага) старога Новага года (1 лістапада) народамі Брытанскіх астравоў. Увядзенне раждзественскага Новага года (25 снежня) ў Рыме (IV ст. н. э.) і яго бытаванне ў краінах Еўропы (XIII—XIV ст). Прычыны пераходу на студзеньскі стыль. Студзеньскае Навагоддзе ў ВКЛ (з 1364 г.). Перавод справаводства канцылярыі Вялікага княства з вераснёўскага на студзеньскі стыль (з 1550 г.).

Язычніцкае пакланенне дрэву ў навагодніх традыцыях. Старажытны германскі звычай адзначэння Новага года з елкай, а таксама з амелай, букам, цісам, ядлоўцам. Арэхавае дрэва – магічнае дрэва старажытных кельтаў на Брытанскіх астравах. Звычай распальвання бадняку (тоўстае палена) ў навагоднюю ноч. Дзед Мароз.

Элементы язычніцтва і хрысціянства ва ўсходнеславянскіх калядных (навагодніх) традыцыях. Куцця. Культ продкаў. Калядаванне і шчадраванне. Маскіраваныя тэатралізаваныя шэсці.

### *Тэма 11.* Святкаванні веснавога і восеньскага раўнадзенстваў

Астранамічная аснова веснавых навагодніх свят. Астранамічнае раўнадзенства і сапраўдны або трапічны год (365 дзён 5 гадзін 48 хвілін 46 секунд). Хрысціянізацыя ўсходнеславянскіх народаў і прыняцце летазлічэння візантыйскага ўзору з мясцовымі традыцыямі (эра – "ад стварэння свету", веснавое Навалецце). Далейшыя пошукі аптымальных сродкаў календара. Афіцыйныя каляндарныя стылі еўрапейскіх краін.

Сінтэз язычніцкай і хрысціянскай культур у веснавой паэзіі беларусаў і іншых народаў. Разнастайнасць і багацце веснавога календара і параўнанне яго са святамі, прысвяткамі, звычаямі народаў Еўропы.

Вялікдзень (Вялічка). Язычніцкія карані свята веснавога раўнадзенства. Традыцыі хрысціянскай Пасхі (афіцыйна з 525 г.). Велікодныя песні, іх матывы. Святы і прысвяткі "рухомага" календара. Традыцыі беларускага валачобніцтва, параўнанне з аналагічнымі традыцыямі іншых народаў. Каляндарныя валачобныя песні – характэрная адметнасць беларусаў. Іх земляробчая і паэтычная аснова.

Благавешчанне і Саракі ў народным земляробчым коле. Валачобна-паэтычны каляндар як адлюстраванне ў ім пасхальнага, благавешчанскага і сакавіцкага стыляў.

Сістэма БНК з жывёльнымі, птушынымі культамі. Юр'е (23 красавіка/6 мая) – асноўнае свята жывёлы. Ярылавіца. Пастухоўскія абрадавыя гульні і звычаі. "Юраўскі (тураўскі) карагод". Асноўныя матывы беларускіх юраўскіх песень. Свята Міколы. Агляд гіпатэтычнай рэканструкцыі задыякальнага календара, зробленага на аснове беларускага матэрыялу. Параўнанне юраўскіх звычаяў з традыцыямі народаў свету.

Адзначэнне восеньскіх свят народамі свету. Пачатак Новага года ў верасні з візантыйскага перыяду. Вулканаліі старажытных рымлян. 321 г. – афіцыйнае ўвядзенне святкавання пачатку новага года (з 23 верасня, затым з 1 верасня) рымскім імператарам Актавіянам Аўгустам. Асаблівасці святкавання вераснёўскага Навалецця старажытнымі германцамі, егіпцянамі (Александрыйскі каляндар, 26 г. да н. э.), манголамі, грузінамі, яўрэямі. Каляндар Французскай рэвалюцыі. Увядзенне вераснёўскага Навалецця (каляндарнага стылю) ў Расіі (з 1493 па 1700 гг.) замест 1 сакавіка. Выкарыстанне яго ў ВКЛ побач з візантыйскім студзеньскім стылем, у "Малой падарожнай кніжцы".

Канцэнтрацыя святкаванняў вакол дня асенняга раўнадзенства (22—23.09): Багач (8/21.09), Стаўроўскія Дзяды (13/26.09), Звіжанне (14/27.09), Іван Пакроўны (26.09/9.10). Восеньскі народны каляндар беларусаў і народаў Еўропы. Традыцыі беларускага Багача (Малая Прачыста, Другая Багародзіца, Нараджэнне Божае Маці). Памінальныя звычаі. “Дзяды”.

Дзень Сымона – свята асенняга Навалецця. Прападобны Сямён Стоўпнік (459 г.). Пачатак індыкта, Навалецця (з праваслаўнага царкоўнага календара). Сымон у беларускіх прыказках і прыкметах, звычаях. Абрад “жаніцьбы коміна (пасьвета, лучніка)”. Асноўная рытуальная песня “Ой, прыйшлі ж ночанькі доўгенькі...”. Вераснёўскія традыцыі народаў Еўропы запальвання святла ў майстэрнях. Свята Агню ў індыйскім эпасе “Рамаяма”.

### *Тэма 12.* Гісторыя беларускага календара ў кнізе

Рукапісныя кнігі X–XVIII ст. (“Палата кнігапісная”). Развіццё астранамічных ведаў на беларускіх землях. Гравюры Аляксандра Тарасевіча, творы Францыска Скарыны, Сімяона Полацкага і інш. Грыгарыянскае летазлічэнне ў Вялікім княстве Літоўскім і адлюстраванне яго ў Баркулабаўскім летапісе і інш. дакументах.

Першыя друкаваныя календары ў Еўропе (1474 г., нямецкі астраном Іаган Рэгіамантан). “Малая падарожная кніга” (1523 г.) Францыска Скарыны як першы друкаваны каляндар ва ўсходніх славян і народаў былога СССР. Дзейнасць Іллі Капіевіча, Івана Фёдарава і Сымона Полацкага ў Расіі.

Гісторыя развіцця каляндарнай справы да нашых дзён. Першыя друкаваныя календары. Вывучэнне этнографамі і фальклярыстамі народнага календара. Каляндар і каляндарна-абрадавая паэзія беларусаў у запісах і зборах П. Шэйна, П. Бяссонава, Ч. Пяткевіча, М. Федароўскага, К. Машынскага, І. Бермана, Ю. Крачкоўскага, Е. Раманава, М. Нікіфароўскага, М. Косіч, З. Радчанка, У. Дабравольскага, А. Багдановіча, А. Сержпутоўскага і інш. Фарміраванне сталай традыцыі друкаваных календароў. Каляндар “Нашай нівы” з 1910 г. і адлюстраванне ў ім вуснай народнай творчасці. Выпуск беларускіх календароў у Варшаве, Кракаве, Маскве, Петраградзе, Вільні, Брэсце, Гомелі, Гродне, Магілёве, Мінску, Полацку, Супраслі і інш.

Спробы стварэння штучнага “рэвалюцыйнага” календара ў першыя гады савецкай улады. Палітыка ваяўнічага атэізму і барацьба з нацдэмаўшчынай. “Беларускі сялянскі настольны каляндар на 1928 год” (склад. А. Матусевічам і выдадзены мінскай газетай “Беларуская вёска”) і новыя ў ім святы (Калектыва, Сьцяг, Воля, Бунтар, Сьмена, Кветкі і інш.). Спроба стварэння рускага рэвалюцыйнага “імянінніка” (Вектор – “великий коммунизм торжествует”, Виль – “В. И. Ленин”, Лапанальда – “лагерь папанинцев на льдине”, Луиджи – “Ленин умер, но идеи живы”, Даздраперма – “да здравствует 1 мая!”, Ясленик – “я с Лениным и Крупской” і інш.).

Вывучэнне народнага календара ў наш час. Першыя сістэматызаваныя рэканструкцыі БНК. Выпуск разнастайных календароў беларускімі выдавецтвамі (календары-кніжкі, адрыўныя, настольныя, ілюстраваныя,

агульнай тэматыкі або спецыяльныя) і адлюстраванне ў ім фальклору. Адрыўны каляндар “Родны край” (з 1990 г.).

Паняцце пра вечныя і аглядныя календары. Выкарыстанне каляндарных табліц, формулаў. Недасканаласці існуючага летазлічэння (розная працягласць месяцаў, кварталаў, паўгоддзяў, дні тыдня і месяцы не супадаюць са сталымі датамі, колькасць працоўных дзён у месяцы не аднолькавая і інш.). Праекты новага календара.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

“Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі” (па выбары) для дзённай формы атрымання адукацыі

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Пазааўдыторная самастойная работа | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (нагляднья, метадычныя дапаможнікі і інш.) лекцыі | Формы кантролю ведаў практычныя заняткі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя заняткі | семінарскія заняткі | лабараторныя заняткі | ктруемая (кантралюемая) самастойная работа студэнтаў (іншае | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| | **I семестр** | | | | | | | | |
| | **РАЗДЗЕЛ I. ТЭОРЫЯ ЛЕТАЗЛІЧЭННЯ** | | | | | | | | |
| **1** | **Астральныя ўяўленні чалавека і месяцавае злічэнне часу** | **2** | **1** | | | | | | |
| 1.1 | 1. Прадмет і задачы вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі”.<br>2. Тэорыя летазлічэння. | 1 | | | | | | 1, 2, 20, 25 | |
| 1.2 | 1. Астральныя ўяўленні чалавека.<br>2. Месяцавае злічэнне часу. | 1 | | | | | | 1, 2, 20, 25 | |
| 1.3 | 1. Астральныя ўяўленні чалавека.<br>2. Месяцавае злічэнне часу. | | 1 | | | | | 1, 2, 20, 25 | Даклады |
| **2** | **Сонечнае і сонечна-месяцавыя летазлічэнні** | **2** | | | | | | | |
| 2.1 | 1. Сонечнае летазлічэнне.<br>2. Сонечна-месяцавае летазлічэнне | 2 | | | | | | 1, 2, 20, 25 | |
| **3** | **Цыклічны каляндар і каляндарныя эры. Семантыка дзён тыдня і гадзіннікі** | **2** | **1** | | | | | | |
| 3.1 | 1. Цыклічны каляндар.<br>2. Каляндарныя эры. | 1 | | | | | | 1, 2, 20, 25 | |
| 3.2 | 1. Цыклічны каляндар. | | 1 | | | | | 1, 2, 20, 25 | Круглы стол |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Каляндарныя эры. | | | | | | | | |
| 3.3 | 1. Семантыка дзён тыдня.<br>2. Гадзіннікі і прыборы для вымярэння часу. | 1 | | | | | | 1, 2, 20, 25, 32 | |
| | **РАЗДЗЕЛ ІІ. ГІСТОРЫЯ ЛЕТАЗЛІЧЭННЯ. КАЛЕНДАРЫ СВЕТУ** | | | | | | | | |
| **4** | **Гісторыя вывучэння каляндарных звычаяў і абрадаў** | **2** | | | | | | | |
| 4.1 | 1. Разнастайнасць календароў свету.<br>2. Гісторыя вывучэння каляндарных звычаяў і абрадаў. | 2 | | | | | | 1, 3-4, 8, 21-22 | |
| **5** | **Старажытнаіндыйскі каляндар. Кітайскі сельскагаспадарчы каляндар. Мусульманскі каляндар і летазлічэнне** | **2** | **1** | | | | | | |
| 5.1 | 1. Старажытнаіндыйскі каляндар.<br>2. Старажытнаіндыйскія тэксты аб стварэнні свету, касмічным часе. | 1 | | | | | | 1, 3, 8, 12, 18 | |
| 5.2 | 1. Старажытнаіндыйскі каляндар.<br>2. Старажытнаіндыйскія тэксты аб стварэнні свету, касмічным часе. | | 1 | | | | | 1, 3, 8, 12, 18 | Прэзентацыі |
| 5.2 | 1. Кітайскі сельскагаспадарчы каляндар.<br>2. Мусульманскі каляндар і летазлічэнне. | 1 | | | | | | 1, 3, 8, 18 | |
| **6** | **Старажытнаегіпецкі каляндар. Каляндар майя** | **2** | | | | | | | |
| 6.1 | 1. Старажытнаегіпецкі каляндар.<br>2. Каляндар майя. | 2 | | | | | | 2, 17, 32, 46 | |
| **7** | **Гісторыя Еўрапейскіх каляндарных стыляў. Старажытнагрэчаскі каляндар** | **2** | **1** | | | | | | |
| 7.1 | 1. Гістарычныя карані еўрапейскага календара.<br>2. Фарміраванне ўласных календароў народаў Еўропы. | 1 | | | | | | 2, 17, 32, 46 | |
| 7.2 | 1. Старажытнагрэчаскі каляндар.<br>2. Каляндарныя святы і абрады Старажытнай Грэцыі. | 1 | | | | | | 2, 17, 32, 46 | |
| 7.3 | 1. Старажытнагрэчаскі каляндар.<br>2. Каляндарныя святы і абрады Старажытнай Грэцыі. | | 1 | | | | | 2, 17, 32, 46 | Рэфераты |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **РАЗДЗЕЛ ІІІ. БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР: АСАБЛІВАСЦІ І ЭТАПЫ ІСНАВАННЯ** | | | | | | | | |
| **8** | **Прынцыпы і фактары фарміравання народнага календара** | **4** | **1** | | | | | | |
| 8.1 | 1. Паняцці “беларускі народны каляндар”, “хранатоп”, “свята”, “прысвятак”.<br>2. Асаблівасці і этапы фарміравання БНК.<br>3. Прынцыпы фарміравання народнага календара. | 2 | 1 | | | | | 1, 10, 11, 41, 43 | Тэст |
| 8.2 | 1. Фактары фарміравання “народнай рэлігіі” і календара.<br>2. Сацыяльна-палітычны фактар.<br>3. Прыродна-геаграфічнага фактар.<br>4. Фактар святочнага і бытавога характару. | 2 | | | | | | 1, 10, 11, 41, 43 | |
| **9** | **Сінтэз язычніцкай і хрысціянскай культур (2 гадзіны)** | **2** | | | | | | | |
| 9.1 | 1. Царкоўна-рэлігійны фактар фарміравання народнага календара.<br>2. Сінтэз язычніцкай і хрысціянскай культур у Беларусі. | 2 | | | | | | 1-2, 5, 11-12, 16, 47 | |
| **10** | **Традыцыйныя святы летняга і зімовага сонцастаянняў (4 гадзіны)** | **4** | **1** | | | | | | |
| 10.1 | 1. Святы летняга сонцастаяння ў беларусаў.<br>2. Культы агню і вады | 2 | | | | | | 1-2, 5, 19, 40, 47 | |
| 10.2 | 1. Святы зімовага сонцастаяння ў беларусаў.<br>2. Элементы язычніцтва і хрысціянства ва ўсходнеславянскіх калядных (навагодніх) традыцыях. | 2 | 1 | | | | | 1-2, 5, 19, 40, 47 | Інсцэніроўка фрагмента свята |
| **11** | **Святкаванні веснавога і восеньскага раўнадзенстваў (4 гадзіны)** | **4** | | | | | | | |
| 11.1 | 1. Святы веснавога раўнадзенства.<br>2. Веснавы народны каляндар беларусаў і народаў Еўропы. | 2 | | | | | | 1-2, 15, 18, 31 | |
| 11.2 | 1. Святы восеньскага раўнадзенства.<br>2. Восеньскі народны каляндар беларусаў і | 2 | | | | | | 1-2, 15, 18, 31 | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | народаў Еўропы. | | | | | | | | |
| **12** | **Гісторыя беларускага календара ў кнізе (2 гадзіны)** | **2** | | | | | | | |
| 12.1 | 1. Летазлічэнне ў беларускіх летапісах, кнігах і інш. дакументах.<br>2. Эвалюцыя календара ў кнігах.<br>3. Вывучэнне народнага календара ў наш час. | 2 | | | | | | 1-3, 6, 7, 27, 45 | |
| | **Усяго** | **30** | **6** | | | | **46** | | **Залік** |

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

“Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі” (па выбары) для завочнай формы атрымання адукацыі

| Нумар раздзела, тэмы, занятка | Назва раздзела, тэмы, занятка; пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Пазааўдыторная самастойная работа | Метадычнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) лекцыі | Формы кантролю ведаў практычныя заняткі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя заняткі | семінарскія заняткі | лабараторныя заняткі | ктруемая (кантралюемая) самастойная работа студэнтаў (іншае) | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| **І год навучання 1 семестр** | | | | | | | | | |
| | **Раздзел I. Тэорыя летазлічэння.** | | | | | | | 1, 2, 20, 25 | |
| 1 | Астральныя ўяўленні чалавека і месяцавае злічэнне часу. Сонечнае і сонечна-месяцавыя летазлічэнні | 1 | | | | | | | |
| | **Раздзел II. Гісторыя летазлічэння: календары свету** | | | | | | | 2, 17, 32, 46 | |
| 2 | Старажытнаіндыйскі каляндар. Кітайскі сельскагаспадарчы каляндар. Мусульманскі каляндар і летазлічэнне | 1 | | | | | | | |
| 3 | Старажытнаегіпецкі каляндар. Каляндар майя | 1 | | | | | | 2, 17, 32, 46 | |
| | **Раздзел III. Беларускі народны каляндар: асаблівасці і этапы існавання** | | | | | | | 1, 10, 11, 41, 43 | |
| 6 | Прынцыпы і фактары фарміравання народнага календара | 1 | | | | | | | |
| | **Усяго** | **4** | | | | | | | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **І год навучання 2 семестр** | | | | | | | | | |
| 8 | Святы летняга і зімовага сонцастаянняў | 1 | | | | | | 1-2, 5, 19, 40, 47 | |
| 9 | Святкаванні веснавога і восеньскага раўнадзенстваў | 1 | | | | | | 1-2, 15, 18, 31 | |
| | **Усяго** | **2** | | | | | | | |
| | **Усяго** | **6** | | | | | | | **Залік** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная:**

1. Беларуская фальклярыстыка : Каляндар і каляндарна-абрадавая паэзія : вучэб.-метад. дапам. / А. Ю. Лозка, Н. Г. Мазурына. – 2-е выд. – Мінск : БДПУ, 2015. – 134 с.
2. Володомонов, Н. В. Календарь: прошлое, настоящее, будущее / Н. В. Володомонов. – М. : Наука, 1987. – 80 с.
3. Лозка, А. Ю. Беларуская фальклярыстыка : Каляндар і каляндарна-абрадавая паэзія : вучэб.-метад. дапам. / А. Ю. Лозка, Н. Г. Мазурына. – Мінск : БДПУ, 2009. – 104 с.
4. Пяткевіч, Ч. Грамадская культура Рэчыцкага Палесся / Часлаў Пяткевіч; пер. з пол. Уладзіміра Васілевіча і Ліі Салавей; прадм. Ганны Энгелькінг. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 319 с.

**Дадатковая:**

5. Агапкина, Т. А. Мифологические основы славянского народного календаря. Весенне-летний цикл. – М. : Индрик, 2002. – 816 с.
6. Агіевіч, У. У. Імя і справа Скарыны : У чыіх руках спадчына / У. У. Агіевіч – Мінск : Навука і тэхніка, 2002. – 319 с.
7. Агіевіч, А. А. Да пытання аб пачатку беларускага кнігадруку / А. А. Агіевіч // Роднае слова. – 2006. – №9. – С. 105–107.
8. Алексеев, В. В. Мир русских календарей. [Текст] : научно-популярное издание / В. В. Алексеев. – М., 2002. – 158 с.
9. Асов, А. И. Славянская астрология : Звездомудрие, звездочетец, календарь, обряды / А. И. Асов. – М. : ФАИР-ПРЕСС, 2001. – 256 с.
10. Беларуская народная творчасць. Шматтомная серыя. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972 – 2007.
11. Беларускі фальклор : Энцыклапедыя: У 2 т. – Мінск : БелЭн, 2005; 2006.
12. Берман, И. Календарь по народным преданиям в Воложинском приходе Виленской губернии Ошмянского уезда / И. Берман. // Записки Императорского РГО по отделению этнографии. – СПб., 1873. Т.5. – С. 1–44.
13. Бикерман, Э. Хронология Древнего мира : Ближний Восток и античность / Пер. с англ. И. М. Стеблин-Каменского. – М.: Наука, 1975. – 336 с.
14. Бородин, О. Р. Возникновение современной хронологии : учеб. пособ. для вузов культуры и искусств / Московский гос. ун-т культ. и иск. – М. : Изд-во МГУКИ, 2000. – 248 с.
15. Васілевіч, У. А. Беларускі народны каляндар / У. А. Васілевіч. – Мінск : Ураджай, 1993. – 182 с.
16. Жыцця адвечны лад : Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2 / Уклад. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1998. – 614 с.
17. Календарь в культуре народов мира : сб. ст. / Рос. АН, Ин-т этнологии и антропологии им. Н. Н. Миклухо-Маклая; [Отв. ред. Н. Л.

Жуковская, С. Я. Серов; Предисл. С. Я. Серова]. – М. : Наука : Изд. фирма "Вост. лит.", 1993. – 270 с.

18. Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы : Весенние праздники / Институт этнографии им. Н. Н. Миклухо-Маклая АН СССР. – М. : Наука, 1977. – 360 с.

19. Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы (конец XIX – начало XX в.) : Зимние праздники / Институт этнографии им. Н. Н. Миклухо-Маклая АН СССР. – М.: Наука, 1973. – 352 с.

20. Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы : Исторические корни и развитие обычаев / Институт этнографии им. Н. Н. Миклухо-Маклая АН СССР. – М. : Наука, 1983. – 224 с.

21. Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы : Летне-осенние праздники / Институт этнографии им. Н. Н. Миклухо-Маклая АН СССР. – М. : Наука, 1978. – 296 с.

22. Календарные обычаи и обряды народов Восточной Азии. Годовой цикл. – М. : Наука, 1989. – 340 с.

23. Календарные обычаи и обряды народов Восточной Азии. Новый год. – М. : Наука, 1985. – 276 с.

24. Календарные обычаи и обряды народов Передней Азии. Годовой цикл. – М. : Наука, 1998. – 336 с.

25. Климишин, И. А. Календарь и хронология. 3-е изд. / И. А. Климишин. – М. : Наука, 1990. – 480 с.

26. Крук, Я. Сімволіка беларускай народнай культуры. – Мінск : Беларусь, 2011. – 430 с.

27. Лозка, А. Ю. Беларускі народны каляндар. 2-е выд. / А. Ю. Лозка. – Мінск : Полымя, 2002. – 240 с.

28. Лозка, А. Ю. Беларускі каляндар у славянскім і еўрапейскім свеце : манаграфія / А. Ю. Лозка. – Мінск, 2002. – 202 с.

29. Лозка, А. Ю. Беларускі задыякальны каляндар / А. Ю. Лозка // Мастацтва. – 2004. – № 1. – С. 49–51.

30. Лозка, А. Ю. Беларускі народны каляндар і еўрапейскае летазлічэнне / А. Ю. Лозка // Беларуская мова і літаратура. 2008. – №1. – С. 53–57.

31. Лозка, А. Ю. Валачобна-каляндарны пантэон/ А. Ю. Лозка // Весці БДПУ. – 2003. – № 4. – С. 161–167.

32. Михаль, С. Часы. От гномона до атомных часов / С. Міхаль. Научный ред. В. А. Шполянский. Сокр. перевод с чешского Мельнера Р. Е. – М. : Знание, 1983. – 256 с.

33. Нікалаеў, М. Палата кнігапісная : рукапісная кніга на Беларусі ў X–XVIII стагоддзях / М. Нікалаеў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1993. – 239 с.

34. Рыбаков, Б. А. Язычество Древней Руси / Б. А. Рыбаков. – М. : Наука, 1987. – 790 с.

35. Рыбаков, Б. А. Язычество древних славян. 2-е изд. / Б. А. Рыбаков. – М. : Наука, 1994. – 610 с.

36. Сейл, Ричард. Эти странные исландцы / Ричард Сейл. – М. : Эгмонт Россия, 2004. – 96 с.

37. Толстая, С. М. Полесский народный календарь: Материалы к этнодиалектному словарю. А – Г / С. М. Толстая // Славянское и балканское языкознание. – М. : Наука, 1984. – С. 178–200.

38. Толстая, С. М. Полесский народный календарь : материалы к этнодиалектному словарю. Д – И / С. М. Толстая // Славянское и балканское языкознание. – М.: Наука, 1986. – С. 98–131.

39. Толстая, С. М. Полесский народный календарь : материалы к этнодиалектному словарю. К – П / С. М. Толстая // Славянский и балканский фольклор. – М.: Наука, 1986. – С. 178 – 242.

40. Толстая, С. М. Полесский народный календарь : материалы к этнодиалектному словарю. Р – Я / С. М. Толстая // Славянский и балканский фольклор. – М., 1995. – С. 251 – 317.

41. Толстая, С. М. Полесский народный календарь / С. М. Толстая. – М., 2005.

42. Толстой, Н. И. Времени магический круг (по представлениям славян) / Н. И. Толстой // Логический анализ языка. Язык и время. – М., 1997. – С. 28 – 35.

43. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: У 6 т. / Аўт. кал. : Варфаламеева Т. Б. – Мінск : Бел. навука, 2001 – 2008.

44. Усов, В. В. Русский народный православный календарь. В 2-х тт. / В. В. Усов. – М. : Изд. дом МСП, 1997.

45. Францыск Скарына і яго час : энцыкл. давед. – Мінск : БелСЭ, 1988. – 608 с.

46. Хренов, Л. С., Голуб, И. Я. Время и календарь /Л. С. Хренов, И. Я. Голуб. – М. : Наука, 1989. – 130 с.

47. Шамякіна, Т. І. Міфалогія Беларусі (нарысы) /Т. І. Шамякіна. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2000. – 280 с.

48. Цыбульский, В. В. Лунно-солнечный календарь стран Восточной Азии / В. В. Цыбульский. – М. : Наука, 1988. – 384 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Самастойная работа студэнтаў па засваенні вучэбнай дысцыпліны “Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі” (па выбары) складаецца з шэрагу відаў дзейнасці:

1. Азнаямленне са схематычнымі малюнкамі, табліцамі па гісторыі каляндарнай традыцыі. Стварэнне схем, табліц.
2. Праца з навуковай літаратурай, матэрыяламі архіваў. Праца з Інтэрнэт-рэсурсамі.
3. Падрыхтоўка дакладаў, рэфератаў па прапанаванай выкладчыкам тэматыцы.
4. Прагляд відэазапісаў правядзення заняткаў, экскурсій.
5. Наведванне музеяў (Нацыянальнага мастацкага музея, Музея старажытнабеларускай культуры, валуноў і інш.).
6. Стварэнне тэстаў і прэзентацый па матэрыялах дысцыпліны.

# ПЕРАЛІК СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Для дыягностыкі сфарміраванасці кампетэнцый студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне “Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі” (па выбары) рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя сродкі:

- круглы стол;
- прэзентацыі;
- даклады;
- тэсты;
- рэфераты;
- інсцэніроўка фрагмента свята;
- залік.

Выніковай формай кантролю ведаў і ўменняў студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне з’яўляецца залік.

## ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| Сучасныя тэндэнцыі развіцця тэорыі і методыкі культуралагічных дысцыплін | Кафеда тэорыі і методыкі выкладання мастацтва | Прапаноў аб зменах няма | Пратакол № 10 ад 12.05.2017 г. |

ДОПОЛНЕНИЯ И ИЗМЕНЕНИЯ К УЧЕБНОЙ ПРОГРАММЕ
УЧЕБНОЙ ДИСЦИПЛИНЫ «Календарь во времени и пространстве: истоки, синтез культур, стили (по выбору)»
(специальность 1-08 80 02 Теория и методика обучения и воспитания (мировая художественная культура))
на 2019/2020 учебный год

| №№ пп | Дополнения и изменения | Основание |
|---|---|---|
| 1 | Заменить список основной литературы следующими источниками:<br>1. Руднев, В. Н. Эстетика. История мировой литературы и искусства : учеб. пособие / В. Н. Руднев. – М. : Директ-Медиа, 2015. – 362 с.<br>2. Абакумова, Н. И. Музыка Беларуси : пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения : в 2 ч. / Н. И. Абакумова. – Минск : ВИТпостер, 2016–2018. – Ч. 2. – 2018. – 355 с. | 1. Обновление списка основной литература в связи с истечением срока действия грифованых учебных пособий. |

Учебная программа пересмотрена и одобрена на заседании кафедры теории и методики преподавания искусства (протокол № 6 от 27.01.2020)

Заведующий кафедрой
теории и методики преподавания искусства
доктор искусствоведения, доцент ________ Ю.Ю.Захарина

УТВЕРЖДАЮ
Декан факультета эстетического образования
кандидат пед. наук, доцент ________ И.И.Рыжикова

Методист отдела магистратуры ________ О.А.Сергушкина